онлайн, но заслуживают определенного внимания. Так как постоянно растущая аудитория всемирной сети Интернет представляет собой перспективный рынок, который нельзя игнорировать, объективной реальностью становится необходимость создания собственного web-сайта.

Предоставляя в распоряжение отеля такие преимущества как оперативность, эффективность, стабильность (наличие собственного сайта является показателем успешного бизнеса), возможность предоставления клиентам услуги виртуальной демонстрации и услуги online бронирования, рекламный актив — сайты становятся все более обоснованным средством привлечения и удержания клиентов.

Но, с другой стороны, сайт требует постоянной работы, развития и совершенствования, он должен соответствовать современному темпу жизни. Только такой сайт будет работать.

Таким образом, создание и развитие сайта — важный этап становления бизнеса, это продвижение торговой марки, процесс обретения лица и имиджа отеля.

***К.А. Галецкая***
БДЭУ (Мінск)

# РОЛЯ ЭКСКУРСІЙНЫХ ПРАГРАМ У РАЗВІЦЦІ РЭГІЁНУ

Усё большую значнасць у сучаснай эканоміцы Рэспублікі Беларусь набывае турызм. Экскурсійныя праграмы існуюць як самастойна, так і могуць складаць частку турызму. Экскурсійная праграма — распрацаваны загадзя маршрут экскурсіі з уключэннем у зрокавы рад найбольш прывабных, цікавых гістарычных рэалій і мясцін, звязаных са знакамітымі асобамі.

Распрацоўка новых экскурсійных праграм (маршрутаў) у адпаведнасці з мерапрыемствамі "Нацыянальнай праграмы развіцця турызму на 2006—2010 гг." набывае асаблівую актуальнасць у цяперашні час. Упершыню прапануецца дакладна распрацаваны экскурсійны маршрут па зямлі Карэліччыны пад назвай "Зямля і людзі". Распрацаваны маршрут мае гісторыка-краязнаўчы кірунак і пачынаецца на ўсходзе Гродзенскай вобласці з населенага пункта з незвычайнай назвай Карэлічы.

Мястэчка Карэлічы вядома з 1395 г. Мястэчка — прамежкавая паміж горадам і вёскай (вялікім сялом) форма паселішча. Спачатку з мястэчкам атаясамлялі невялікі гарадок. І гэта, увогуле, заканамерна, бо "местам" раней называлі горад. Мястэчка спачатку належала магнатам Чартарыйскім, а затым — Радзівілам. Вядомасць гэтаму невялікаму мястэчку прынесла заснаваная па загаду Міхаіла Радзівіла шпалерная мануфактура, дзе ткаліся незвычайнай прыгажосці сапраўдныя дываны-карціны — габелены.

У зрокавы экскурсійны рад у Карэлічах будуць уключаны помнікі Яну Чачоту (беларускі і польскі паэт, фальклярыст, сябар А. Міцкеві-

ча, Т. Зана, І. Дамейкі, які зрабіў уплыў на іх творчасць сваімі прарамантычнымі баладамі, заснаванымі на беларускім фальклоры) і М.П. Арцюху (з'яўляўся сакратаром падпольнага райкома камсамола ў гады Айчынай вайны), мясціны дзяцінства таленавітага вучонага і акадэміка з міравым імем — Барыса Кіта. Таксама ў Карэлічах можна наведаць Свята-Петрапаўлаўскую царкву, вайсковыя могілкі і мемарыяльны комплекс.

Вёскі Турэц, Ярэмічы, Сіняўская Слабада, якія ўваходзяць у распрацаваны мршрут, таксама багатыя цікавымі экскурсійнымі аб'ектамі: велічны і прыгожы храм у Турцы, капліца ў Ярэмічах, маляўнічыя краявіды Сіняўскай Слабады; яны ж з'яўляюцца радзімай не менш знакамітых асоб — паэта-сатырыка А. Дзеркача, "Беларускага Шаляпіна" Пятра Конюха, Героя Савецкага Саюза У.З. Царука, беларускага пісьменніка У.А. Калесніка.

На Карэліцкай зямлі знаходзіцца адзін з чатырох помнікаў Беларусі, уключаных у Спіс сусветнай культурна-гістарычнай спадчыны ЮНЕСКА — замкавы комплекс "Мір".

Хто хаця б раз пабываў на Карэліцкай зямлі, абавязкова захоча зноў наведаць гэты чароўны куток нашай роднай Беларусі. Муры Мірскага замка перанясуць вас у сівую даўніну, магутнасць Нёмана надасць вам упэўненасці і спакою, а шчырасць і добразычлівасць людзей назаўсёды пакінуць у вашых сэрцах толькі самыя прыемныя ўспаміны.

Прыведзены экскурсійны маршрут — толькі невялікая частка рэгіёну, які мае шмат экскурсійных аб'ектаў, што могуць быць уключаны ў шматлікія экскурсійныя праграмы гісторыка-краязнаўчага, архітэктурна-будаўнічага і прыродазнаўчага характару. А вядомыя ў свеце персаналіі, якія маюць свае карані на гэтай зямлі, паспрыяюць зацікаўленасці да наведання гэтых мясцін не толькі экскурсантамі нашай краіны, але і замежнымі гасцямі. У сваю чаргу ўсё гэта паўплывае на развіццё Карэліччыны як турыстычнага рэгіёну.

БДЭУ. Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ. Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.°.
BSEU. Belarus State Economic University. Library.